Новы дом, дзе пасяліўся Пан

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
30.12.2018 00:00



Касцёл св. Яўхіма ў Клюшчанах (дэканат Астравец) перажыў 2 сусветныя вайны, а таксама перыяд рэлігійных ганенняў. Святыня, грунтоўна адноўленая некалькі гадоў таму, была дашчэнту знішчана падчас пажару 6 чэрвеня 2017 года. Мясцовыя парафіяне пазбавіліся месца малітвы, дзе “сэрца цешылася, а душа адпачывала”. Вялікая страта

Сёння там, дзе калісьці стаяў старажытны драўляны касцёл, што захапляў сваім знешнім выглядам, віднеецца яго разбураны фундамент. Падчас пажару была знішчана ўся маёмасць святыні, у тым ліку 2 старажытныя абразы: Маці Божай Чанстахоўскай і св. Юрыя, мучаніка. Багатую гісторыю касцёла, які цяпер можна ўбачыць толькі на памятных здымках з прыватных архіваў, жыхарам і гасцям Клюшчанаў прыгадвае абгарэлы місійны крыж. †



Кожны раз, калі праходжу міма таго месца, дзе калісьці стаяў касцёл, адчуваю смутак і жаль. Клапаціліся пра яго, як пра ўласны дом, а можа, нават больш... Гэта вялікая страта для нас і вялікі боль, – адзначае Галіна Пецюлевіч, старшыня парафіяльнай рады. – ***Заўсёды з ахвотай ішлі ў святыню на малітву, паколькі для ўсіх парафіян гэта было асаблівае месца. Менавіта там мы супольна ўдзельнічалі ў Эўхарыстыі, пасля чаго абгаворвалі бягучыя справы, што датычылі вёскі і ваколіц”.***

Не апускаючы рукі

Пасля пажару вернікі перажылі шок, аднак смела і пакорна прынялі гэтае выпрабаванне. ***“Спачатку з’явілася думка, каб на старым фундаменце ўзвесці такі самы касцёл,*** – распавядае пробашч парафіі кс. Анатоль Захарэўскі. – ***А днак паўсталі пытанні: за якія грошы і для каго? З года ў год колькасць***

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
30.12.2018 00:00

парафіян памяншаецца... Старэйшае пакаленне паволі адыходзіць у вечнасць, моладзь выязджае ў вялікія гарады. Пасля таго, як мы грунтоўна абмеркавалі сітуацыю і абмалілі яе, спыніліся на тым, каб аднавіць старую плябанію, зрабіўшы з яе капліцу".

На дапамогу нешматлікай супольнасці вернікаў, якая сёння налічвае каля 140 асоб, прыйшлі католікі з усёй Гродзенскай дыяцэзіі: перадавалі матэрыяльныя ахвяраванні, а таксама некаторыя літургічныя прылады. ***"Мы сустрэліся з вялікім разуменнем і незвычайнай зычлівасцю многіх людзей, якія працягнулі нам руку дапамогі, а таксама падтрымалі малітоўна. Дзякуючы гэтаму маем сёння прыгожую капліцу, дом, дзе пасяліўся Пан",*** – адзначае кс. Анатоль.

У клюшчанскай парафіі служыў кс. Канстанцін Стэповіч (паэтычны псеўданім – Казімір Св



Святар дадае, што мясцовыя вернікі ў меру сваіх магчымасцей аказваюць усякую дапамогу. Не засталіся абыякавымі і людзі, якія паходзяць з Клюшчанаў, а сёння жывуць у вялікіх гарадах ці за мяжой: у Літве, Латвіі. ***"Усіх аб'яднала адна ідэя – стварэнне новага месца малітвы, дзе будзе збірацца жывая супольнасць вернікаў",*** – тлумачыць мясцовы пробашч.

На сёння плябанія адноўлена не толькі ўнутры, але і звонку. Тры пакоі злучаны ў адзін, заменены вокны і дзверы, пастаўлены новыя лаўкі. У новай каплічцы ўжо ёсць 2 алтары: галоўны ў гонар св. Яўхіма, заступніка парафіі, а таксама бакавы ў гонар Маці Божай Чанстахоўскай, культ якой здаўна распаўсюджаны сярод мясцовых вернікаў.

З верай гледзячы ў будучыню

Вызначаны ўжо планы на бліжэйшыя гады: трэба ўзнесці над будынкам вежы з крыжом і ўпарадкаваць прылягаючую тэрыторыю. На месцы знішчанай пажарам святыні мясцовыя вернікі хочуць паставіць новы крыж разам з памятнай табліцай, дзе будзе змешчана гістарычная інфармацыя пра старажытны касцёл.

Новы дом, дзе пасяліўся Пан

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
30.12.2018 00:00

